ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (1062) ● Чацвер, 26 верасня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## АГАЯД ПАДРЫХТАВАНАСЦІ

Набліжаецца пачатак навучальнага года ў сістэме палітычнай адукацыі. І таму невыпадкова адным з галоўных у павестцы дня пасяджэння партыйнага камітэта было пытанне аб падрыхтаванасці ўсіх звенняў да пачатку заняткаў.

Член парткома В. Р. Шлык паведаміла, што ў гэтым навучальным годзе ва універсітэце павялічылася колькасць праблемных, метадалагічных семінараў. Цяпер іх будзе 50 замест 44 у мінулым годзе. Новыя семінары арганізаваны на кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, у інстытуце прыкладных фізічных праблем, вылічальным цэнтры і ў іншых падраздзяленнях. Да чатырох школ асноў марксізму-ленінізму дабавілася яшчэ адна. Будзе працаваць таксама 20 пачатковых палітшкол.

1 кастрычніка пад кіраўніцтвам 80 вопытных прапагандыстаў прыступяць да заняткаў больш дзвюх тысяч слухачоў.

Для вывучэння ў сістэме вышэйшага звяна партыйнай, камсамольскай і эканамічнай вучобы прапанаваны наступныя тэмы: «Савецкі спосаб жыцця: сутнасць і асноўныя рысы»; «Пабудова ў СССР развітога сацыялістычнага грамадства — перамога ідэй камунізму»; «Актуальныя праблемы ідэалагічнай барацьбы на сучасным этапе»; «Актуальныя праблемы ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання савецкага чалавека»; «Фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду — аснова атэістычнага выхавання працоўных»; «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе сацыяльна-эканамічныя праблемы»; «Моладзь і грамадскі прагрэс»; «XXIV з'езд КПСС аб асноўных пытаннях эканамічнай палітыкі партыі на сучасным этапе»; «XXIV з'езд КПСС аб знешнепалітычнай дзейнасці партыі і Савецкага ўрада».

## ПРАПАНУЕ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»

У гэтым навучальным годзе універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды» падрыхтавала для сваіх слухачоў новыя цікавыя сустрэчы. У актавай зале галоўнага корпуса і на асобных факультэтах выступяць навуковыя супрацоўнікі Ленінградскага Эрмітажа. Яны прачытаюць цыкл лекцый «Музеі свету».

Другі новы цыкл — «Па краінах і кантынентах» — будуць весці навуковыя супрацоўнікі Інстытута міжнародных адносін АН СССР.

Знамянальнай даце — 30-годдзю перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі — прысвячаецца цыкл «Гарады-героі нашай краіны». Лекцыі з гэтага цыкла будуць прачытаны на факультэтах.

Заваявалі папулярнасць лекцыі з цыкла «Інтэлектуальная праца ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі». Сёлета слухачоў чакаюць новыя лекцыі з гэтага цыкла.

Пад агульнай назвай «Дасягненні астрафізікі» запланаваны выступленні буйнейшых вучоных-астрафізікаў нашай краіны.

З серыяй лекцый «Знешняя палітыка і міжнароднае становішча СССР» выступяць кваліфікаваныя лектары Масквы і Мінска.

Будуць арганізаваны таксама сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, працы, Вялікай Айчыннай вайны — людзьмі цікавага лёсу, удзельнікамі гераічных падзей.

**М. РЭЗНІКАЎ,**
**старшыня прэзідыума праўлення арганізацыі таварыства «Веды» БДУ.**

## НАПРУЖАНА, БОЛЬШ ЭНЕРГІЧНА

**На савеце універсітэта разгледжаны вынікі мінулага навучальнага года і задачы на сёлетні. З дакладам выступіў рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі.**

**Ніжэй мы змяшчаем некаторыя лічбы і факты з даклада.**

У МІНУЛЫМ навучальным годзе паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання ў вясеннюю экзаменацыйную сесію склала 93,7 працэнта, што на тры працэнты вышэй, чым у 1972-1973 навучальным годзе. Вышэй за сярэднюю паспяховасць на геаграфічным — 98,1 працэнта, юрыдычным — 98, гістарычным —97,9, філалагічным — 97. Найбольш нізкая на фізічным факультэце — 88,7.

Калі параўнаць паспяховасць па курсах, то найбольш высокая яна на пятым — 99,5, чацвёртым — 95,8 і найбольш нізкая на другім і трэцім — 91,0.

Павысілася паспяховасць у параўнанні з 1972-1973 навучальным годам на факультэце прыкладной матэматыкі на 3,7 працэнта, юрыдычным — 3,6, філалагічным—1,2, гістарычным—1,9, матэматычным — 1,8, фізічным — 2,2, біялагічным — 12,6, геаграфічным 6,1, спецфакультэце прыкладной матэматыкі — 10,4. Знізілася паспяховасць на хімічным факультэце на 1,2, факультэце журналістыкі — 1,6 працэнта.

На фізічным факультэце хаця паспяховасць і павысілася, усё ж яна па-ранейшаму застаецца больш нізкай, чым у цэлым па універсітэту.

На вячэрнім аддзяленні вынікі вясенняй экзаменацыйнай сесіі характарызуюцца наступнымі данымі: абсалютная паспяховасць тут склала 85,3 працэнта. Высокіх паказчыкаў дабіліся факультэты: хімічны (90,0), гістарычны (89,1), біялагічны (87,6) геаграфічны (88,1).

Ніжэй сярэдняй паспяховасць студэнтаў-вячэрнікаў маюць факультэты: філалагічны (80,5), фізічны (82,7), журналістыкі (77,3), матэматычны (84,0).

Дэканам факультэтаў і загадчыкам кафедр, дзе паспяховасць студэнтаў ніжэй, чым у цэлым па універсітэту, прапанавана неадкладна прааналізаваць прычыны такога становішча і на аснове далейшага паляпшэння вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы дабіцца значнага павышэння паспяховасці.

Задачы, якія стаяць перад універсітэтам у 1974-1975 навучальным годзе, павінны рашацца ў наступных напрамках:

прадугледжваць у лекцыйных курсах правільны адбор інфармацыі, адпавядаючай сучаснаму стану навукі і тэхнікі;

садзейнічаць паляпшэнню навукова абгрунтаванага планавання вучэбна-выхаваўчага працэсу;

забяспечваць далейшае ўдасканаленне вучэбнага працэсу шляхам больш эфектыўнай пастаноўкі навукова-метадычнай работы і выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання;

прадоўжыць далейшае вывучэнне рацыянальнага выкарыстання бюджэту часу і арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, асабліва першага і другога курсаў;

забяспечыць правільную расстаноўку выкладчыцкіх кадраў для найбольш мэтазгоднага выкарыстання іх на навукова-педагагічнай рабоце.

З мэтай далейшага ўдасканалення вытворчай практыкі належыць поўнасцю абнавіць па ўсіх спецыяльнасцях праграмы практыкі, прадугледзеўшы ў іх умацаванне даследчых элементаў у вытворчых умовах і далучэнне студэнтаў да дзейнасці калектываў прадпрыемстваў па выкананню народнагаспадарчых планаў 1974 і 1975 гадоў.

Кафедрам трэба перагледзець тэматыку кантрольных і курсавых работ, зацвердзіць тэматычныя планы лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў, спецкурсаў і спецсемінараў, змест і месца правядзення вучэбнай і вытворчай практыкі. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на якасць і тэрміны рэцэнзавання кантрольных работ.

У мінулым навучальным годзе некалькі актывізавалася работа кафедр, факультэтаў па ўкараненню і выкарыстанню ў вучэбным працэсе тэхнічных сродкаў навучання і вылічальнай тэхнікі. Сёлета завершаны мантаж васьмі лінгафонных кабінетаў і класа кантралюючых машын «КІСІ-5». Створаны дзве лабараторыі клавішных вылічальных машын. Для фізічнага факультэта набыты два відэамагнітафоны.

З гэтага года пачалі функцыяніраваць лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання і вучэбна-метадычны кабінет.

Для прафесарска-выкладчыцкага саставу былі арганізаваны курсы па вывучэнню вылічальнай тэхнікі, для маладых выкладчыкаў працаваў універсітэт педагагічнага майстэрства.

Аднак кафедры ўсё яшчэ недастаткова праяўляюць ініцыятывы і настойлівасці пры ўкараненні тэхнічных сродкаў навучання. Ім неабходна прыняць дзейсныя меры для больш шырокага выкарыстання сродкаў дыяпраекцыі, кіно, радыё, тэлебачання, сродкаў вылічальнай тэхнікі у вучэбным працэсе, а вучэбнаму аддзелу — арганізаваць выраб дыядапаможнікаў для кафедр у агульнауніверсітэцкай фоталабараторыі.

Намечана вялікая праграма ў галіне навукова-даследчай работы. Прадугледжваецца забяспечыць выкананне плана гаспадарча-дагаворных работ на 102 працэнты, укараніць у народную гаспадарку вынікі па 24 тэмах навукова-даследчых работ і атрымаць эканамічны эфект не менш 1 млн. 600 тыс. рублёў. Падрыхтаваць да друку і выдаць не менш 100 манаграфій, дапаможнікаў і падручнікаў, апублікаваць 1720 артыкулаў у навуковых часопісах. Давесці колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце, да 6800 чалавек (цяпер—6000).

Гэта толькі частка работы. Праграма дзейнасці універсітэцкага калектыву адлюстравана ў плане на 1974-1975 навучальны год і ў перспектыўным плане. З імі неабходна ўважліва азнаёміцца і забяспечыць няўхільнае ажыццяўленне ўсіх прадугледжаных мерапрыемстваў.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

### ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ПЕРШЫ СЕМЕСТР 1974-1975 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

● **Пытанні палітычнага і эканамічнага жыцця**

Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага, эканамічнага жыцця ўнутры краіны, рэспублікі і за мяжой (два разы ў месяц).

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя — трыумф ленінізму.

Асноўныя напрамкі эканамічнай палітыкі партыі на сучасным этапе.

Роля сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі ў прагрэсе навукі і тэхнікі.

Дабрабыт народа — сэнс і мэта дзейнасці партыі.

Дасягненні мінчан у выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС.

Сталіца БССР Мінск — горад-герой, горад-працаўнік.

● **Пытанні камуністычнага выхавання**

У. І. Ленін аб камуністычным выхаванні моладзі.

Аб выніках рэспубліканскага сходу партыйнага актыву. (Аб мерах па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадраў у партарганізацыях Беларусі»).

Гуманістычны характар эстэтычнага ідэалу камунізму.

Выхаванне ідэйнай пераканасці—важнейшая ўмова барацьбы супраць буржуазнай маралі.

Прытрымліванне законнасці — неад'емная рыса савецкага спосабу жыцця.

Духоўнае багацце савецкага чалавека.

Нормы паводзін савецкага чалавека.

Патрэбнасць — густ — мода—ідэал.

● **Пытанні міжнароднага жыцця**

Ленінскі прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам— рэальная сіла сучаснага міжнароднага развіцця.

Барацьба КПСС, брацкіх марксісцка-ленінскіх партый за адзінства і згуртаванасць сусветнай сістэмы сацыялізму.

Класавы характар знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы.

Імперыялізм — злейшы вораг міру і прагрэсу.

Антыкамунізм — ідэалогія імперыялізму.

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні тав. КЛЯЎЧЭНІ А. С. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

За шматгадовую навукова-педагагічную работу і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць загадчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прафесара **Кляўчэню** Аляксандра Сямёнавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.**

18 верасня 1974 года.
г. Мінск.

**Ударна працуюць у гаспадарках Бярэзінскага раёна студэнты геаграфічнага факультэта.**

**Штодзённа перавыконваюць норму — збіраюць па 850 кг бульбы на кожнага чалавека — другакурснікі ў саўгасе «Першамайскі».**

**Шырокі струмень жыта б'ецца ў далонях Раі Далбачовай, якая працуе на зернетаку саўгаса «Баравіно».**

Фота **Д. Прэса.**





# ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

## РЭПАРТАЖ З БУЛЬБЯНОГА ПОЛЯ





Фота Д. Чаховіча.

Вялізныя бульбіны мякка стукаюцца адна аб другую. Хутка напаўняюцца чатырохвугольныя бляшаныя скрыні. Менавіта ў іх збіраюць крамяныя клубні студэнты ФПМ, для якіх адрас трэцяга працоўнага семестра — саўгас «Буцэвічы» Мінскага раёна.

— У асноўным ураджай у гэтым годзе добры, — лічаць дзяўчаты. — Буйную бульбу збіраць лягчэй і весялей.

Хутка мільгаюць іх рукі, а хлопцы падхопліваюць цяжкія вёдры, перакульваюць іх у кузаў трактара.

...У вёсцы Казекава жывуць дзве групы студэнтаў з трэцяга і чацвёртага курсаў. Для чацвёртакурснікаў тут мясціны знаёмыя. Іх атрад і ў мінулым годзе дапамагаў гэтаму ж саўгасу. Не прыйшлося нанава ўсё наладжваць вопытным паварам — як і ў папярэднюю восень,



Лена Васілеўская, Ларыса Казлоўская і Жэня Карабчук здзіўляюць сваім майстэрствам аднакурснікаў. Сёлета стравы, прыгатаваныя паварамі, прыйшліся да спадобы і іх малодшым сябрам.

Абед звычайна канчаецца а другой гадзіне. Дарога да поля скарачаецца размовамі. Чаго толькі не пачуеш: і меркаванні пра ўчарашні хакейны матч, і пра гаспадынін пачастунак — сакавітыя яблыкі і слівы, і пра новыя песні.

— А мы тут, у вёсцы, навучыліся хутка запрагаць каня! — у голасе Галі Бізун і Надзі Анісёнак чуецца гордасць. Вось дык дзяўчаты!



Поле сустракае рокатам трактароў.

Мо яно і цяжка адразу пасля абеду ўцягнуцца ў звыклы рытм работы, але толькі не для Галі Раманенка і Люды Атрошкінай (IV курс). Яны заўсёды наперадзе, паспрабуй, дагані! Ды і не толькі яны. Камандзір групы Таня Шастакова ні на кога не можа паскардзіцца:

— Усё ў нас ідзе добра, дружна. Днём — на полі, вечарам — у клубе. Гучыць музыка, прывозяць да нас і кіно. Пасля гарачага працоўнага дня прыемна адпачыць.

Яе падтрымлівае трактарыст Пётр Фёдаравіч Ярмольчык:

— Студэнты працуюць якасна, без заган.

Але ж прыйдзецца ўспомніць, што ў пачатку работы не ўсё ладзілася ў студэнтаў-чацвёртакурснікаў. Яны працавалі на другім полі, не заўсёды выконвалі норму. А зараз іх перавялі да трэцякурснікаў. І хто ведае, ці то дух спаборніцтва дапамог, ці то бульба тут вырасла буйнейшая — добра пайшлі справы.

Працуюць студэнты весела. На тое ж яны і студэнты. Раз-пораз чуецца жартаўлівы смех:

— Вовачка, Котаў! Дапамажы, вядро зламалася...

— Не вытрымала працоўнага энтузіязму...

А наводдаль расце доўгі бурт, у якім будзе захоўвацца «другі хлеб» узімку. Адзін за другім пад'язджаюць гружаныя трактары, і ссыпаецца ў яго важкая залацістая бульба...

С. ТАМАРОВІЧ.

## АНАЛІЗУЮЦЬ КАМІСІІ

**На мінулым тыдні камісіі універсітэта выязджалі ў раёны для праверкі эфектыўнасці працы студэнтаў на сельскагаспадарчых работах. Адну з іх, што была накіравана ў Чэрвеньскі раён, узначальваў дацэнт хімфака В. Н. Мардыкін.**

**Як адзначылі правяраючыя, у асноўным усе студэнты, а тут працуюць біёлагі, гісторыкі, хімікі, юрысты, выконваюць устаноўленыя нормы. Спачатку яны ўдзельнічалі ва ўборцы льну, сушылі і сартавалі зерне, а потым большасць была пераведзена на ўборку бульбы.**

**Адзначаны і недахопы. Некаторыя з іх прама ў ходзе праверкі былі ліквідаваны. Выказаны таксама заўвагі, што датычаць арганізацыі працы, санітарнага стану кухняў, транспартнай забяспечанасці і іншых.**

**НАШ КАР.**

## АРЫЕНЦІР

Сёлета, як і кожны год, гасцінна сустракае бібліятэка новае універсітэцкае папаўненне. Хутка нахлыне сюды гаманлівая чарада першакурснікаў, якія пастараюцца запасціся на ўвесь год патрэбнай літаратурай. Бібліятэка для іх — зацікаўлены дарадчык.

На трэцім паверсе каля чытальных залаў размясцілася ў вітрынах тэматычная выстаўка «Да дыплома першы крок».

Імкнуцца супрацоўнікі бібліятэкі больш падрабязна пазнаёміць навічкоў у першую чаргу з навучальнай установай. Таму сабраны тут кнігі і альбомы, выданыя да 50-годдзя універсітэта. Побач — некалькі зборнікаў агульнага характару: «Моладзь і адукацыя», «Вышэйшая школа ў Савецкай Беларусі», «Эканамічныя праблемы вышэйшай адукацыі ў СССР», а таксама разлічаныя менавіта на новых чытачоў: «Парады студэнтам», «У дапамогу першакурсніку».

Для тых, хто адразу зацікавіцца навуковай работай, прапануецца зборнік «Студэнцкая навуковая творчасць».

Ніжэй на паліцы размясціліся брашуры, выданыя ў розных універсітэтах краіны: «Арганізацыя самастойнай работы студэнта» (Мардоўскі універсітэт), кніга Б. Т. Іагансена «Навуковая арганізацыя самастойнай работы студэнтаў» (Томскі універсітэт), «Індывідуальная работа са студэнтамі ВНУ» (выданне Латвійскага універсітэта). Брашуры выкладчыкаў Маскоўскага, Дагестанскага і нашага універсітэтаў расказваюць аб тым, як выконваць і афармляць курсавыя работы.

Нямала ў экспазіцыі артыкулаў з часопісаў па тых ці іншых важных для першакурснікаў праблемах.

Кнігі медыцынскіх выдавецтваў аб арганізацыі працы і быту студэнтаў лагічна завяршаюць выстаўку.

**Наш кар.**

# ТАМ, ДЗЕ СТУДЭНТАМ ЗА 30...

Спецфакультэт прыкладной матэматыкі. Паскораная падрыхтоўка спецыялістаў у галіне матэматычнага забеспячэння ЭВМ і АСК. Апошні год існавання факультэта.

Заўважце, тут многа незвычайнага: вялікая насычанасць вучэбнай праграмы; студэнты — матэматыкі, фізікі, інжынеры, эканамісты; тэрмін навучання — два-тры гады.

Цяпер, калі амаль усе студэнты БДУ працуюць у гаспадарках рэспублікі, толькі спецфакультэт жыве ў сваім звычайным зладжаным рытме: стукае аб дошку мел, звіняць званкі, нешта запісвае ў расклад заняткаў сакратар.

1.

Зазірнем у адзін з пакояў. Тут працуе Мікалай Аляксандравіч Палякоў, супрацоўнік дэканата.

Ён і пазнаёміў нас з сённяшнім днём факультэта.

— Вы памятаеце, што факультэт створан тры гады назад?

Навукова-тэхнічны прагрэс вынес на перадавую лінію электронна-вылічальную тэхніку, аўтаматычныя сістэмы кіравання. Тэрмінова мноству прадпрыемстваў, ведамстваў і нават міністэрстваў сталі патрэбны знаўцы ЭВМ і навейшай тэхнікі. Ды і зараз пытанне аснашчэння прамысловасці вылічальнымі машынамі не знята з парадку дня. Каб ліквідаваць разрыў паміж павелічэннем колькасці ЭВМ і забяспечанасцю спецыялістамі, былі выкарыстаны ўсе магчымасці. Акрамя ФПМ, ва універсітэце ствараецца спецыяльны факультэт прыкладной матэматыкі. Надзённая праблема рашаецца шляхам удасканалення кваліфікацыі ўвогуле або перакваліфікацыі работнікаў вытворчасці. Таму ў нас вы можаце сустрэць і былога праграміста або кіраўніка вытворчага ўчастка, і чалавека, які ўжо закончыў раней матфак або фізфак БДУ. Але не думайце, што наш факультэт занадта «стары». Вось Валерый Казлоў, сакратар камсамольскай арганізацыі, Галіна Іпатава, парторг, і яшчэ мноства студэнтаў — іх цяжка адрозніць ад астатняй масы навучэнцаў БДУ.

І ўсё ж такі яны адметныя. Быццам і паходка крыху іншая, паважная, і вочы глядзяць сур'ёзней, пільней. У кожнага за плячыма багаты жыццёвы вопыт, амаль палавіна студэнтаў мае сям'ю, дзяцей. Але гэта знешняя адметнасць.

Ёсць і ўнутраная. Яны не лічаць сябе толькі студэнтамі. Жыве ў сэрцы клопат аб сваім заводзе, участку, вылічальным цэнтры. У іх цесная сувязь з прамысловымі аб'ектамі ўсёй рэспублікі. Вучэбная практыка — на сваім прадпрыемстве, у ведамстве; выкананне курсавых і дыпломных работ — таксама. Дарэчы, тэматыка гэтых работ адпавядае сённяшнім патрэбам і задачам вытворчасці. У большасці выпадкаў дыплом выпускніка факультэта тоесны вырашэнню якой-небудзь праблемы на прадпрыемстве. Так вось і атрымліваецца: чалавек яшчэ вучыцца, а ўжо кампенсуе затрачаныя на яго вучобу сродкі.

Вы самі можаце пазнаёміцца з нашымі студэнтамі. Зараз пачнуцца ў адной з груп практычныя заняткі.

2.

Я спецыяльна пайшла туды, дзе павінны былі адбыцца заняткі па навуковаму камунізму. Матэматыкі яны, відаць, добрыя, ну, а як абстаяць справы з грамадскімі дысцыплінамі?

...Шамаценне старонак, шэпт «дайце хутчэй канспект», нехта дапісвае тэзісы адказу — нічога дзіўнага, усё, як заўсёды.

— Тэма: «Месца і роля рабочага класа ў сусветным рэвалюцыйным працэсе». Хто будзе адказваць? — пытаецца выкладчык Мікалай Назаравіч Літоўка.

Яшчэ да заняткаў ён ахарактарызаваў групу:

— Ёсць цікаўныя, дапытлівыя людзі. Хаця ўвесь вольны час адбірае вышэйшая матэматыка, рыхтуюцца да заняткаў добра.

Гэта было так. Асабліва спадабаўся мне нетаропкі грунтоўны адказ А. Вішнеўскага. І выкладчык быў задаволен: студэнт звярнуў увагу на сувязь рабочага руху з НТР, прывёў цікавыя прыклады, спыніўся на сучасных падзеях.

А ў студэнта Ю. Палякова сістэма адказу іншая — на выручку прыходзіць канспект...

Празвінеў званок. Некалькі чалавек падышло да Мікалая Назаравіча, каб узяць тэму для будучага даклада.

У дзверы ўварваўся шум перапынку:

— Таня, купі мне два коржыкі...

— Ну, як расце твой малыш?..

3.

У дэканаце знаёмы нам Мікалай Аляксандравіч гутарыць з дэканам спецфакультэта Уладзімірам Трафімавічам Водневым. Размова ідзе пра дыпломнікаў.

У бягучым годзе факультэт робіць апошні выпуск, самы вялікі — больш чым 220 спецыялістаў. Павялічылася нагрузка і на дэканат, і на кафедры, і на выкладчыкаў-кіраўнікоў. Але самая значная нагрузка, безумоўна, кладзецца на студэнтаў.

Уявіце, што ў вас ушчыльненая вучэбная праграма — два-тры гады замест пяці, няма пераддыпломнага вольнага часу — вы здаеце і зімнюю, і летнюю сесіі. Тады вы скажаце, што адолець гэта могуць толькі выпрабаваныя жыццём людзі з загартаванай воляй і вялікай працаздольнасцю.

З другога боку, тут паўстае праблема кіраўніцтва практыкай. На прадпрыемствах, дзе выпускнік рыхтуе дыпломную работу, часта няма спецыялістаў у галіне электронна-вылічальнай тэхнікі, якія б маглі дапамагчы, параіць, растлумачыць памылкі. Сапраўды, дзе ўзяць кваліфікаванага кіраўніка дыпломнай, напрыклад, у аб'яднанні «Мінскхлебпром»? Як жа факультэт спраўляецца з гэтай праблемай?

— Мы стараемся пасылаць студэнтаў на буйнейшыя прадпрыемствы, у лепшыя вылічальныя цэнтры. Канешне, цяжар клопатаў кладзецца на нашы кафедры і кафедры ФПМ. Яшчэ стаіць верасень, а мы гаворым пра дыпломныя, падахвочваем выпускнікоў ужо зараз клапаціцца аб тэме, збіраць матэрыял.

4.

І яшчэ адно пытанне вельмі цікавіла — вучоба.

— «Хвасцісты»? Яны, вядома, ёсць. Нямнога, але ёсць. Выклікаем на партбюро, на пасяджэнні камітэта камсамола, паведамляем на прадпрыемствы, устанаўліваем тэрміны...

Але, заўважце, «хвасцісты» ў нас інакшыя, чым на другіх факультэтах. Двойкі паяўляюцца ў асноўным не ад ляноты, не ад душэўнай слабасці, а ад нястачы ведаў і часу: чалавек даўно закончыў ВНУ або сярэднюю спецыяльную ўстанову, працаваў на заводзе, крыху забыў тэорыю... Зусім цяжка тым, каму прыходзіцца перакваліфікавацца з інжынераў, эканамістаў у праграмісты, «прыкладнікі». Бывае ж так, што цэлы дзень — адна «сухая» матэматыка: матаналіз, дыферэнцыяльныя ўраўненні, вышэйшая алгебра.

— Але прагал у ведах адбіваецца дрэнна на вучобе толькі ў першы час. Потым студэнт уваходзіць у звычайную каляіну. Таму загады аб выключэнні ў нас амаль не паяўляюцца.

5.

У заключэнне дарэчы прывесці такую даведку.

У 1971 годзе факультэт пачаў працаваць. У 1973 г. адбыўся першы выпуск — 41 чалавек, у наступным — 113. З іх каля палавіны атрымалі дыпломы без троек, а 8 чалавек — «чырвоны» дыплом.

Сярод выпускнікоў Ф. А. Гарачоў, начальнік ВЦ Полацкага хімкамбіната, Г. Г. Зыблеў, начальнік ВЦ Аршанскага завода «Чырвоны Кастрычнік», Г. Л. Дабраедаў, намеснік начальніка ВЦ Полацкага нафтаперапрацоўчага завода і г. д.

Згадзіцеся, даведка красамоўная.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

## 29 ВЕРАСНЯ — 70 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. А. АСТРОЎСКАГА

# ЖЫЦЦЁ—ПОДЗВІГ



Мікалай Аляксеевіч Астроўскі нарадзіўся 29 верасня 1904 года ў сяле Вілія, на Украіне. Калі пачалася першая сусветная вайна, сям'я Астроўскіх эвакуіравалася ў Шэпятоўку—буйны чыгуначны вузел. Адзінаццацігадовага Колю ўладкоўваюць кубаўшчыкам у станцыйны буфет. «Мы... яшчэ дзецьмі папалі пад капіталістычны прыгнёт, і... замест радаснага дзяцінства нас чакала знясільваючая капіталістычная праца з ранку да позняй ночы літаральна за кавалак хлеба»,—так пісаў М. Астроўскі пра гэтыя гады.

Юнацтва М. Астроўскага супала з найвялікшай падзеяй у гісторыі чалавецтва — Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй. У 1919 годзе ў Шэпятоўцы быў створан Рэвалюцыйны камітэт. Старшыня Рэўкома І. С. Ліннік расказвае: «У Шэпятоўскі Рэўком прыйшоў худзенькі віхрасты хлапчук Коля Астроўскі. Ён настойліва прасіў, каб яму далі работу, таму што ён «не можа сядзець склаўшы рукі, калі наўкола кіпіць новае, бурнае жыццё».

Так М. Астроўскі пазнаёміўся з бальшавікамі.

У ліпені 1919 года пятнаццацігадовы Мікалай Астроўскі ўступае ў рады Камуністычнага Саюза Моладзі і ідзе добраахвотнікам у Чырвоную Армію.

Успамінаючы баявыя гады свайго юнацтва, пісьменнік гаварыў: «Вы што ж думаеце, на нас сонца не свяціла ці жыццё не здавалася нам цудоўным, ці не было для нас прывабных дзяўчат, калі мы насіліся па фронту і перажывалі баявыя буры? У тым якраз і справа, што жыццё нас клікала. Мы, можа больш за іншых, адчувалі яго зачараванне, але цвёрда ведалі, што самае галоўнае зараз — знішчыць класавага ворага і адстаяць рэвалюцыю. Гэта ўсведамленне заглушала ўсё. Яно налівала нашы маладыя сэрцы энтузіязмам і вялікім гневам супраць эксплуатататараў. Мы ўраганам несліся, агаліўшы шашкі, на варожыя рады, і гора было ўсім тым, хто пападаў пад нашы ўдары».

У 1921—24 гадах Мікалай Астроўскі—важак камсамольцаў электрацэха кіеўскіх Галоўных чыгуначных майстэрань, а затым Бераздоўскага і Ізяслаўскага раёнаў Шэпятоўскай акругі.

У жніўні 1924 года Ізяслаўскі райком КП(б)У прыняў М. А. Астроўскага ў рады партыі бальшавікоў.

Раненне, напружаная праца адбіліся на стане здароўя Мікалая Астроўскага. У 1927 годзе цяжкая хвароба прыкавала яго да ложка, а праз два гады дваццаціпяцігадовы Астроўскі страціў зрок.

Давялося мабілізаваць усе сілы: фізічным пакутам былі проціпастаўлены ўпартасць і нязломная воля. Жаданне быць карысным Радзіме, вярнуцца ў рады будаўнікоў сацыялізму дапамагло яму авалодаць новай зброяй—мастацкім словам.

У лістападзе 1930 года М. А. Астроўскі пачаў пісаць раман «Як гартавалася сталь». Пісаў сам, пры дапамозе транспаранта. Радкі, напісаныя ўсляпую, цяжка разбіраліся. Тады ён пачаў дыктаваць. У канцы 1931 года першая частка рамана была закончана. У 1932 годзе ў красавіцкім нумары часопіса «Молодая гвардия» паявілася імя нікому яшчэ не вядомага маладога пісьменніка Мікалая Аляксеевіча Астроўскага. З гэтага нумара пачалася публікацыя рамана «Як гартавалася сталь». У 1935 годзе дзве часткі рамана выйшлі асобнай кнігай. «Раман «Як гартавалася сталь», — пісаў М. Астроўскі, — гэта мой адказ на заклік ЦК ВЛКСМ да савецкіх пісьменнікаў стварыць вобраз маладога рэвалюцыянера нашай эпохі».

1 кастрычніка 1935 года ўрад узнагародзіў М. А. Астроўскага ордэнам Леніна. «...Я глыбока шчаслівы. Мая асабістая трагедыя адціснена дзівоснай, непаўторнай радасцю творчасці і ўсведамленнем, што і твае рукі кладуць цагліны для ствараемага намі цудоўнага будынка, імя якому — сацыялізм...»

У канцы 1934 года М. Астроўскі пачаў дыктаваць першыя главы рамана «Народжаныя бурай». 15 лістапада 1936 года ў Маскве, на кватэры па вуліцы Горкага, 14 (дзе цяпер Дзяржаўны музей М. А. Астроўскага), адбылося пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў, прысвечанае абмеркаванню першай часткі рамана «Народжаныя бурай». На пасяджэнні выступалі прадстаўнікі ЦК ВЛКСМ, пісьменнікі А. Серафімовіч, А. Фадзееў, В. Стаўскі, М. Асееў, В. Герасімава і іншыя. Першае выданне кнігі выйшла невялікім тыражом у снежні 1936 года, у дзень пахавання пісьменніка. На апошняй старонцы кнігі — зварот да чытачоў ад рэдакцыі «Молодая гвардия»: «Чытач! Гэта кніга з'яўляецца першай часткай вялікага твора, задуманага аўтарам у трох тамах. Яна была напісана чалавекам, прыкаваным да ложка цяжкай хваробай, і закончана за некалькі дзён да смерці. Смерць вырвала пяро з яго рук у самы росквіт творчай працы».

Пасля смерці пісьменніка ў рады барацьбітоў сталі яго кнігі. У дні Вялікай Айчыннай вайны яны натхнялі савецкіх воінаў на ратныя подзвігі. У 1944 годзе група байцоў арміі генерала В. І. Чуйкова пісала ў музей М. А. Астроўскага: «...12 гадоў таму назад Мікалай Астроўскі прывёў у нашу сям'ю свайго героя—Паўла Карчагіна. Ён адразу стаў для нас таварышам і сябрам. Ён навучыў нас галоўнаму — любві да жыцця, Радзімы і нянавісці да ворагаў... І калі мы вернемся дадому пасля перамогі, мы прынясём вам не адзін томік «Як гартавалася сталь» з прастрэленымі і абпаленымі старонкамі, каб людзі маглі бачыць, як разам з намі на ўсіх франтах змагаўся за Радзіму яе бяссмяротны сын, наш сябар і брат Карчагін-Астроўскі».

Пасля вайны Павел Карчагін разам з моладдзю будаваў шахты, заводы, асвойваў цаліну і пракладваў шляхі ў космас.

Творы Мікалая Астроўскага карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў многіх краінах свету. У музеі М. А. Астроўскага захоўваецца чырвоны сшытак маладога патрыёта Паўднёвага В'етнама. Ён ад рукі перапісаў у сшытак старонкі з рамана М. Астроўскага «Як гартавалася сталь». Дзесяць гадоў вандраваў сшытак разам з маладым байцом па палях бітваў Паўднёвага В'етнама, яго чыталі ў акопах і бліндажах у перапынках паміж баямі. Бессмяротны вобраз Паўла Карчагіна натхняў мужных в'етнамскіх патрыётаў у іх гераічнай барацьбе.

Творы Мікалая Астроўскага ўвайшлі ў залаты фонд савецкай літаратуры. Па даных Усесаюзнай кніжнай палаты на 1 студзеня 1970 года творы М. Астроўскага былі выданы ў СССР 510 раз тыражом больш 20 млн. экземпляраў на 59 мовах народаў СССР. Пленум ЦК ВЛКСМ 14 мая 1966 года першую прэмію Ленінскага камсамола прысудзіў пісьменніку Астроўскаму Мікалаю Аляксеевічу — аўтару бессмяротных кніг «Як гартавалася сталь» і «Народжаныя бурай», твораў, якія сталі баявой зброяй камсамола ў выхаванні мільёнаў маладых савецкіх патрыётаў, дастойнай змены старэйшым пакаленням камуністаў».

**Т. ГРАМАШЫНСКАЯ.**

# ДАРАГІ АЎТОГРАФ

У снежні 1935 года я працаваў памочнікам сакратара выканкома Маскоўскага Савета, і мне было даручана арганізаваць работу па рамонту і абсталяванню кватэры для цяжка хворага пісьменніка і яго сям'і. Астроўскі толькі што прыехаў у Маскву і жыў у вагоне.

Я неадкладна пазваніў Астроўскаму. Адказаў сам Мікалай Аляксеевіч. Ён спытаў:

— Вы чуеце мяне?.. Цудоўна. Дык вось, калі для вас не будзе позна (гэта было пасля 22 гадзін), я вельмі прашу вас прыехаць да мяне зараз у вагон. Мы аб усім пагутарым. Я буду чакаць вас.

І вось я на Курскім вакзале. Дзверы салон-вагона мне адчыніла жанчына, як я пазней даведаўся, сястра пісьменніка Кацярына Аляксееўна. Не паспеў я зняць паліто, як з купэ пачуўся бадзёры голас:

— Заходзьце сюды.

У купэ было цёмна. Злева пачуўся выразны голас:

— Давайце вашу руку, будзем знаёмы.

Астроўскі затрымаў маю руку ў сваёй, прапанаваў сесці і папрасіў даць святло. У ліхтар над дзвярыма купэ паставілі свечку. Я ўбачыў Астроўскага. Ён нерухома ляжаў на падушцы, калені крыху падняты і ўхутаны коўдрай. Вочы вялікія і выразныя. Лоб пукаты, вялізны. Твар даўгаваты, худы, але бадзёры і прыемны. Рукі да кісцей нерухомыя, варушыліся толькі пальцы.

Я назваў сваё прозвішча, пасаду і сказаў, што прыбыў да яго па даручэнню Масавета.

— У першую чаргу прашу абсталяваць мой пакой, каб я мог адразу пачаць работу, — падкрэсліў ён, — у любы час сутак, нават уначы.

Я са здзіўленнем запытаў:

— Як можна цяжка хвораму працаваць, ды яшчэ ўначы? Вам лячыцца трэба. Вы ж для гэтага прыехалі ў Маскву.

Астроўскі весела засмяяўся:

— О, вы не ведаеце ўсіх маіх хвароб. Ніякія працэдуры мне ўжо не дапамогуць. У мяне так: адну хваробу лячу, а другую злую, а то ўсе разам злуюцца. Карацей кажучы, я супакойваю і лячу свае хваробы толькі карпатлівай працай. Гэта мае адзінае лякарства...

Просьба Мікалая Аляксеевіча ўзяць яго як мага хутчэй з «цёплай кануры» была выканана ў тэрмін. Гэта была воля партыі, якая выражала любоў усяго савецкага народа да аднаго з яго мужных і лепшых сыноў.

Праз некалькі дзён я прыйшоў да Мікалая Аляксеевіча ўжо на новую кватэру і атрымаў падарунак — кнігу першага выдання «Як гартавалася сталь» з подпісам: «Таварышу Гарачуну з удзячнасцю за цёплую сустрэчу і таварыскія клопаты аба мне ў Маскве. 16 XII-35 г. М. Астроўскі».

Мікалай Аляксеевіч адчуў маю ўсхваляванасць.

— Удзячны вам за клопаты, — сказаў ён. — Я цяпер прадаўжаю працаваць над раманам «Народжаныя бурай». У вялікім даўгу я перад масквічамі — столькі клопатаў прычыніў ім сваім прыездам. Цяпер буду працаваць па 10—12 гадзін у суткі... Некаторым людзям, асабліва маладым, здаецца, што я вельмі нешчаслівы чалавек. А ёсць і такія, што лічаць мяне пакутнікам. Не люблю я гэтых слоў. Бальшавік — гаспадар, а не пакорны слуга і пакутнік... Вось папрацаваць бы мне яшчэ гады два-тры, я напісаў бы, у чым мая сіла і шчасце...

Назаўсёды ў маёй памяці застаўся велічны вобраз Мікалая Астроўскага.

**М. С. ГАРАЧУН,**
**член КПСС з 1924 года.**

# З ВЫКАЗВАННЯЎ М. АСТРОЎСКАГА

**Партыя выхоўвае ў нас свяшчэннае пачуццё — змагацца да той пары, пакуль у табе ёсць іскра жыцця.**

●●●

**Я слухаю біццё сэрца маёй Радзімы любімай... Толькі яна, мая сацыялістычная Радзіма, высока падняла сцяг міру і сусветнай культуры. Толькі яна стварыла сапраўднае брацтва народаў.**

**Якое шчасце быць сынам гэтай Радзімы!..**

●●●

**Нават будучы сляпым і прыкаваным да ложка на працягу многіх гадоў, можна быць байцом і шчаслівым у нашай вялікай краіне, гаспадарамі якой мы з вамі з'яўляемся.**

●●●

**Мы ўсе ў мірнай працы. Наш сцяг — гэта мір. І гэты сцяг партыя і ўрад паднялі высока. Вось чаму ўсё працоўнае чалавецтва глядзіць на нас, як на надзею, як на сваё спадзяванне.**

●●●

**Памятай, што, акрамя асабістага, у нас ёсць значна большае — гэта барацьба і гонар нашай Радзімы.**

●●●

**Асабістыя трагедыі будуць і пры камунізме, але жыццё будзе цудоўнае тым, што чалавек перастане**



**жыць вузкім асабістым жыццём.**

●●●

**Эгаіст гіне раней усяго. Ён жыве ў сабе і дзеля сябе. І калі панявечана яго «я», то яму нечым жыць.**

**Але калі чалавек растварается ў грамадскім, то яго нельга забіць маральна — бо дзеля гэтага трэба забіць усё навакольнае, усё жыццё.**

●●●

**Можа быць дружба без кахання. Але нікчэмнае тое каханне, у якім няма дружбы, таварыскасці, агульных інтарэсаў.**

●●●

**Традыцыі нашай партыі і камсамола даюць непераўзыдзеныя прыклады творчай дружбы... Яны гавораць аб тым, што дружба — гэта, перш за ўсё, шчырасць, гэта крытыка памылак таварыша.**

●●●

**Наша партыя выхоўвае глыбокае пачуццё таварыскасці, дружбы. У гэтым вялікая духоўная сіла — адчуваць сябе ў сяброўскім калектыве.**

●●●

**Мужнасць нараджаецца ў барацьбе, мужнасць выхоўваецца з дня ў дзень ва ўпартым супраціўленні цяжкасцям. І дэвіз нашай моладзі — гэта мужнасць, гэта ўпартасць, гэта перадоленне ўсіх цяжкасцей.**

●●●

**Любоў да Радзімы, памножаная на нянавісць да ворага, толькі такая любоў прынясе нам перамогу.**

●●●

**Уперадзе нас чакае яшчэ больш яркае будучае. Гэта будучае настолькі прывабнае, што ніхто не зможа нас спыніць у барацьбе за яго.**

●●●

**Толькі наперад, толькі на лінію агню, толькі праз цяжкасці да перамогі і толькі да перамогі — і нікуды інакш!**

# *ЗНОЎ У СТРАІ БАЙЦОЎ*

**«У апошнія гады абставіны склаліся так, што мне давялося ў значнай меры звязаць сваё жыццё і работу з жыццём і работай Колі Астроўскага, і яго перамогі і радасць вельмі блізкія мне»,—пісаў Леў Бярсенеў, чалавек з пакалення Карчагіных, вялікі і шчыры сябар М. Астроўскага.**

**«Лёвушка, брат»,—так нярэдка называў Мікалай Аляксеевіч сябра, які прыйшоў да яго ў самы цяжкі час. Прыйшоў і застаўся назаўсёды.**

**Мікалай Астроўскі і Леў Бярсенеў—людзі падобнага лёсу: абодвух загартавала рэвалюцыя і грамадзянская вайна, абодва, нягледзячы на цяжкія хваробы, да апошняй хвіліны заставаліся змагарамі і будаўнікамі новага жыцця.**

**Дэвізам Льва Бярсенева было: «Усё, што магу, і крыху больш». Гэтыя словы і сталі назвай дакументальнай аповесці Алясандра Цырульнікава, якая прысвечана сяброўству двух моцных духам людзей. Урывак з яе мы прапануем чытачам.**

Мікалай Аляксеевіч ляжаў на ложку і слухаў Бярсенева, які чытаў яму газету. Імжэў дождж. Дзень быў шэры. Астроўскі не любіў такія пахмурныя дні. Ні ён, ні Лёвушка не ведалі, што гэты дзень будзе самым яркім і светлым за доўгія гады.

Убегла усхваляваная і бледная Вольга Осіпаўна:

— Кніга, сыночкі, кніга!

Бярсенеў разарваў шпагат, разгарнуў пакет з тоўстай паперы.

— Трымай, Коля!

Астроўскі ўзяў томік у дрыжачыя рукі:

— Ціха, сябры мае, спачатку я сам.

...І вось цяпер Астроўскі трымаў сваё дзецішча ў руках. Тонкія хуткія пальцы яго абмацвалі пераплёт, прабавалі якасць паперы..

Палец Мікалая намацаў на пераплёце ціснёную ўпадзіну. Леў заўважыў, як вочы сябра насцеражыліся. Мікалай стараўся навобмацак вызначыць малюнак на пераплёце. Пальцы не раз вярталіся да ніжняга краю кнігі і яшчэ і яшчэ раз прабягалі па вузкай палосцы малюнка. Лоб яго нахмурыўся. Астроўскі напружана думаў.

— Няўжо гэта штык? Лёвушка, гэта штык?

— Так, Коля, гэта бліскучы сярэбраны штык. Ён наўскос перасякае стальны фон калянкоравага пераплёту...

— Дык гэта ж цудоўна!— вочы Мікалая Аляксеевіча свяціліся, твар ажыў у белазубай усмешцы. — Паслухай, дык гэта ж той самы штык, аб якім пісаў наш сябар Павел Карчагін брату Арцёму! Гэта ж мой штык, мая новая зброя, з якой я разам з усімі вамі буду ў страі барацьбітоў за сацыялізм!

Мікалай Аляксеевіч зноў і зноў распытваў Бярсенева аб кнізе, прасіў яшчэ раз апісаць яе словамі, расказаць аб пераплёце, аб якасці паперы, шрыфце.

Астроўскі прасіў яго чытаць главу за главой, перарываў чытанне, выхопліваў кнігу, і зноў яго пальцы бегалі па малюнку на пераплёце ад канца ствала вінтоўкі да вастрыя штыка.

...Леў Мікалаевіч успамінаў, што такое хваляванне ахоплівала Мікалая Аляксеевіча кожны раз, калі ён упершыню браў у рукі новае выданне сваёй кнігі, хаця іх ўжо налічваліся дзесяткі, а агульны тыраж пераваліў за мільён экземпляраў.

Мікалай Аляксеевіч моцна любіў савецкую літаратуру, а сваю кнігу любіў, як баец сваю асабістую зброю.

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



Валерый ДРАНЧУК

Я засну на світанні.
Як рукі мае, параскінуты вёслы,
і лодка — нястрымана рэзва —
Гуляе на ціхай світальнай вадзе.
Я засну на світанні.
Стомленыя блесны
на лесках раскутых,
як рыбы, паснулі.
І зоркі — у загадкавай дымцы —
мігаюць блакітам лускі шчупачынай.
Я засну на світанні.
У твар мне
падула імжыстаю вільгаццю хваль.
Напэўна — у час такі шэра-туманны—
я толькі табою адной не забыты...
І мне не да сну. Я вяслую ізноў,
пакідаючы дымчаты след па вадзе.
Ты не спіш,
ты чакаеш мяне.
Я вязу табе возера ў кропельках
чыстых
на твары, бяссонным ад дум маладых.

## НЕЗВЫЧАЙНА МАГУТНАЯ

Узмах рукі, і... гучыць дзівосная музыка. Здаецца, што гэты ўжо немалады чалавек з сівымі скронямі і надзвычай уважлівымі вачыма асцярожна і пяшчотна дакранаецца да нябачных таямнічых гукаў, прымушаючы іх гучаць то жартоўна і весела, а то задуменна і мякка. Гукі растуць і дужэюць з кожным тактам, нараджаецца мелодыя, але раптам некалькі няўдалых акордаў абрываюць яе.

— Выскачка, — дакарае дырыжор аднаго з баяністаў, які чамусьці вырваўся ўперад, і тлумачыць, адкуль пачаць зноў...

Ідзе рэпетыцыя народнага аркестра народных інструментаў.

Дырыжыруе Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын — мастацкі кіраўнік аркестра. Вось ужо 21 год Міхаіл Аркадзьевіч працуе з калектывам БДУ. Увесь свой талент, усе свае сілы і майстэрства ён аддае сваім выхаванцам. І ў тым, што аркестр — лаўрэат усесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў, вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі мастацкі калектыў, — вялікая яго заслуга.

Таленавіты музыкант, вопытны кіраўнік непрыкметна, з кожнай рэпетыцыяй дапамагае маладым музыкантам духоўна расці і прыгажэць, прывіваючы ім любоў да музыкі.

— Не магу ўявіць сваё жыццё без музыкі, а вучобу ва універсітэце — без нашага аркестра,— гаворыць Люда Хіжняк, студэнтка II курса ФПМ, якая іграе на цымбалах. Яна з захапленнем працягвае:

— Рэпетыцыі ў нас праходзяць цікава.

— Вельмі цікава, — падтрымлівае яе Наташа Бурдэйка, студэнтка філфака, якая іграе на электрааргане. — Мы не толькі іграем, але і слухаем захапляючыя расказы Міхаіла Аркадзьевіча пра Моцарта, Чайкоўскага і іншых вялікіх кампазітараў.

— А як жа наконт часу?— пытаюся я ў Люды Мардас, якая ўжо пяць гадоў іграе ў аркестры на гуслях. — Ці не замінаюць рэпетыцыі вучобе?

— Нікольні, — адказвае Люда. — Я лічу, што музыка. наадварот, дапамагае і жыць, і вучыцца. Яна ж натхняе, дае крылы тым, хто яе разумее і любіць. Яна ж незвычайна магутная.

А калі я гляджу на Міхаіла Аркадзьевіча, бачу — гэта менавіта той чалавек, якому музыка дала сілу.

А. СУЛКОЎСКАЯ.

## САЛАДОСЦЬ ЧЫСТАЕ КРЫНІЦЫ

Ужо вокладка гэтай кнігі* кранае душу і прымушае беражліва ўзяць яе ў рукі. А ўзяўшы, не можаш хутка расстацца. Гартаеш старонкі і быццам п'еш з празрыстай крыніцы народнай творчасці. Здзіўляешся вобразам, прыслухоўваешся да музыкі роднай мовы, яе паэтычнага ладу і чэрпаеш шчодра назапашаныя для цябе... веды!

Так, ці кожны ведае, колькі песень спадарожнічала жыццю беларусаў? А тут знаёмішся з песнямі калляднымі, шчадроўскімі, веснавымі, купальскімі, жніўнымі, восеньскімі — з песнямі так званага земляробчага святочнага календара і сямейна-абрадавымі. Невялікая нататка перад кожным цыклам тлумачыць прызначэнне менавіта гэтых песень, падкрэслівае тыповыя матывы і жанравыя асаблівасці, дае заўвагі да некаторых свят і абрадаў. Вось, напрыклад, як прадстаўлены валачобныя песні: гэта «своеасаблівы і вельмі цікавы народны сельскагаспадарчы каляндар, які ў прыгожых і трапных паэтычных формулах, заснаваных на прыкметах і назіраннях, вызначаў парадак і характар вясковых работ»... Песні-вяснянкі пранізвае клопат селяніна-працаўніка аб тым, каб пабачыць плён сваёй працы «на гумне стагамі, на таку ўмалотам, у млыне памолам, у дзяжы падходам».

Лірычныя, пранікнёныя, услаўляючыя каханне і маладосць, песні летняй пары суседнічаюць з жартаўлівымі і нават з'едлівымі.

І так ад першай да апошняй старонкі лаканічны і адначасова змястоўны ка-



ментарый, сагрэты трапяткой любоўю да народнага паэтычнага слова, вядзе чытача ў захапляючае падарожжа.

Сабралі гэты багаты матэрыял у час фальклорных экспедыцый калектыў кафедры беларускай літаратуры і студэнты, члены навукова-даследчага гуртка.

Закрываеш кнігу з глыбокай удзячнасцю збіральнікам, укладальніку і рэдактару дацэнту Н. С. Гілевічу, мастаку Л. П. Дубавіцкай, чыё афармленне так арганічна зліпося са зместам. І сам ужо можаш пацвердзіць, што адчуў паабяцаную ў прадмове «радасць далучэння да паэзіі чароўнай, вялікай, неўміручай».

А. АЛЕНІЧ.

*) Беларускі фальклор у сучасных запісах. Выдавецтва БДУ, 1974.

## КНІЖКІН ПАШПАРТ

Рэспубліканская выстаўка кніжнага знака, якая праводзіцца ўсяго толькі ў трэці раз, сабрала многа прыхільнікаў малой графікі. І гэта зразумела. Амаль няма ў нас людзей, якія б адносіліся да кнігі з непавагай. Нямала знойдзецца і аматараў—збіральнікаў уласных бібліятэк, для якіх экслібрыс —знак духоўнай сувязі са сваім літаратурным багаццем. Гэтую сувязь звычайна імкнуцца перадаць мастакі-экслібрысты ў графічных вобразах, ствараючы кніжныя знакі як своеасаблівыя лірычныя навелы.

Экслібрыс. Літаральны пераклад гэтага лацінскага слова—«з кніг». Але яно стала ўжывацца значна пазней таго, як паявіўся сам кніжны знак.

Ужо паўтара тысячагоддзя назад на вокладках рукапісных старажытнаегіпецкіх кніг перш-наперш зазначалася імя фараона-ўладальніка, а ўжо потым ішлі звесткі пра кнігу.

На старажытных французскіх фаліянтах захаваліся малюнкі гербаў іх гаспадароў без ніякіх подпісаў. На рускіх кнігах, наадварот, пісалася імя ўладальніка і ўпрыгожвалася якім-небудзь арнаментам.

З узнікненнем кнігадрукавання экслібрыс стаў хутка распаўсюджвацца ва ўсіх краінах Заходняй Еўропы. Дайшлі да нас друкаваныя кніжныя знакі, зробленыя яшчэ пры жыцці Іагана Гутэнберга.

Радзімай экслібрыса ў сучасным, прывычным выглядзе лічыцца Германія XVI ст. Менавіта нямецкія мастакі А. Дзюрэр, Л. Кранах, Г. Гольбейн-малодшы ўпершыню дабавілі да гербаў і вензеляў уладальнікаў кніг алегарычныя і дэкаратыўныя малюнкі.

Узнікненне экслібрыса было абумоўлена жаданнем уладальніка кнігі замацаваць за сабой свае правы на яе, захаваць уласнасць ад крадзяжу. Адначасова экслібрыс быў сведчаннем фамільнага гонару багатых уладальнікаў першых бібліятэк.

Але ў выніку складанага развіцця ён ператварыўся ў знак павагі да кнігі, у сімвал збіральнікаў літаратуры.

Захаваўшыяся экслібрысы ўласных бібліятэк дапамагаюць і зараз вывучаць сувязі і адносіны гаспадароў кніг, іх інтарэсы, прыхільнасці, унутраны свет.

Гісторыя экслібрыса ў Расіі пачалася з часоў Пятра І. Да нашага часу дайшло нямала цікавых узораў маленькай гравюры. У яе жанры працавалі Рэрых і Васняцоў, Врубель і Кустодзіеў, Сомаў, Білібін, Фаворскі.

У Беларусі кніжныя знакі паявіліся ў канцы XVII — пачатку XVIII ст. Належалі яны князям Радзівілам па нясвіжскай лініі.

Першымі мастакамі нашай рэспублікі, якія звярнулі ўвагу на гэты жанр, былі Юдовін, Тычына, Грубе.

У апошні час захапляюцца экслібрысам амаль 50 мастакоў. Апошняя выстаўка знаёміць з 270 работамі трыццаці з іх.

Мы трапляем у свет празрыстых ліній экслібрысаў Б. Заборава, сустракаемся з матывамі старажытнасці ў кніжных знаках І. Капляна. Прадстаўлены ў экспазіцыі работы прызнанага майстра беларускага экслібрыса А. Тычыны, зробленыя ў традыцыях нацыянальнага мастацтва. Захапляюць каляровыя работы М. Селешчука і М. Веліканава. Прыемна сустракаць кніжныя знакі са знаёмымі імёнамі. Вось работа К. Ціхановіча — экслібрыс М. Калачынскага: чысты аркуш паперы, а вакол вянок з яго кніг. Кароткі надпіс «З кніг Янкі Брыля» акружае ружовы факел, які трымаюць чорная, жоўтая і белая рукі. Аўтар—Г. Ціхановіч. А экслібрыс С. Селіханава—языкі чырвонага полымя каля скульптуры, якая стала сімвалам спаленай Хатыні...

Экслібрысы ўпрыгожваюць кнігу. Лепшыя з іх дораць нам эстэтычную радасць. Яны арганічна ўваходзяць у кнігу, характарызуюць яе і яе гаспадароў.

Т. АБРАМОВІЧ.

Апошняя ўсмешка лета. Фота А. Сахашчыка.



## КРАСВОРД



**Па гарызанталі:** 3. Пейзаж. 6. Дамашняя жывёла. 8. Аб'ява, паведамленне. 10. Скрутак, пакунак. 11. Від адзнакі, узнагароды. 14. Закругленне на краі дошкі. 16. Мяцеж. 18. Вядомы савецкі гісторык. 19. Непагадзь. 20. Паўночны вецер. 22. Двухчлен у алгебры. 23. Вечны бадзяга-вандроўнік па біблейскай легендзе. 25. Драма Г. Ібсена. 27. Населены пункт на Віцебшчыне. 31. Свідравальны інструмент. 32. Паветраны вінт у самалёце. 34. Польскі пісьменнік-фантаст. 35. Штат ЗША.

**Па вертыкалі:** 1. Напітак. 2. Адзінка адлегласці ў астраноміі. 4. Кароткі выраз, увасабляючы ідэю. 5. Рух электрычных зарадаў у праваднікy. 7. Граматычная форма. 9. Хімічны элемент. 10. Прыток Прыпяці. 11. Рускі філолаг XIX ст. 12. Мужчынскае імя. 13. Горная сістэма ў Італіі. 15. Гімнастычны снарад. 17. Дзяржава ў Экватарыяльнай Афрыцы. 18. Танец. 19. Зварот у суд з патрабаваннем абароны грамадзянскіх правоў. 21. Прамысловы раён у ФРГ. 24. Земляное ўмацаванне, прыкрыццё. 26. Зямельная мера ў Англіі. 28. Гаручая сумесь для запальных бомб. 29. Драп, сукно пасля спецапрацоўкі. 30. Статак, атара. 31. Лікавая ацэнка поспехаў. 33. Сузор'е.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 05489. Зак. 1238.